*Валянціна Новак*
*Алена Кастрыца*
*Алена Палуян*

# ПРА МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВУЧЭБНАЙ ПРАКТЫКІ ПА ФАЛЬКЛОРУ Ў ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

У апошнія гады ў сістэме адукацыі вышэйшай школы надзвычай папулярны інавацыйныя метады, прыёмы і сродкі навучання, выкарыстанне якіх садзейнічае інтэлектуальнаму развіццю маладых людзей, здольных да нестандартнага, творчага асэнсавання праблемы, самастойных у прыняцці рашэння. Паступовы адыход ад традыцыйнага шляху трансляцыі інфармацыі выкладчыкам, фарміраванне ў студэнтаў умення вучыцца самастойна, актывізацыя іх творчага і разумовага патэнцыялу, асобасная ўключанасць у працэс навучання, гатоўнасць да ўспрымання новага, ініцыятыўнасць, крэатыўнасць – рысы, якія характарызуюць сучасны адукацыйны працэс у вышэйшых навучальных установах.

Фальклорная практыка як важная форма самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца абавязковым этапам пры вывучэнні курса «Фалькларыстыка» на філалагічных факультэтах ВНУ рэспублікі. Як правіла, яна праводзіцца пасля таго, як студэнты авалодалі тэарэтычным курсам і замацавалі набытыя веды на практычных занятках.

Арганізацыя фальклорна-краязнаўчай практыкі павінна забяспечыць рэалізацыю шэрага задач, якія звязаны з вучэбным, навуковым, ідэйна-выхаваўчым кірункамі сучаснага адукацыйнага працэсу вышэйшай школы.

Першапачатковыя веды па зборы і фіксацыі фальклорна-краязнаўчых матэрыялаў, вывучэнні фальклорнай традыцыі ў палявых умовах, па методыцы запісу, сістэматызацыі і камеральнай апрацоўцы звестак студэнты атрымліваюць непасрэдна падчас выканання індывідуальнай работы пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў па той ці іншай тэме. На лекцыйных і практычных занятках яны знаёмяцца з разнастайнымі метадамі і прыёмамі работы ў палявых умовах: апытванне, анкетаванне, назіранне, фіксацыя матэрыялаў пры дапамозе сучасных тэхнічных сродкаў і інш. Не заўсёды студэнты могуць абапірацца на тыя гатовыя ўзоры прадстаўленых у практычных дапаможніках ілюстрацыйных матэрыялаў, бо іншы раз у працэсе выканання індывідуальных заданняў па фальклорна-краязнаўчай практыцы ўзнікаюць сітуацыі, якія патрабуюць умення самавызначацца ў нестандартных абставінах. Таму так важна, каб, акрамя тэарэтычнай вучэбнай падрыхтоўкі ў групах, выкладчык, з мэтай павышэння эфектыўнасці студэнцкіх палявых даследаванняў, праводзіў таксама сур'ёзную індывідуальную работу, пры гэтым варта ўлічваць і рэгіянальны аспект.

Ва УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны» на кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі для збору, фіксацыі і даследавання фальклорнай спадчыны распрацавана праграма фальклорнай практыкі і выдадзены наступныя практычныя дапаможнікі: «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Каляндарная абраднасць"»; «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Прыкметы і павер'і сямейнай абраднасці"»; «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Народная міфалогія беларусаў"»; «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Каляндарныя прыкметы і павер'і"».

З мэтай актывізаваць творчае мысленне студэнтаў і актуалізаваць працэс атрымання ведаў выкарыстоўваецца такі від дзейнасці, як стварэнне мультымедыйных прэзентацый у якасці творчых справаздач па выніках летняй фальклорна-краязнаўчай практыкі. Праграму, у якой выконваюцца падобныя прэзентацыі (Windows Movie Maker,

Microsoft Power Point), студэнты выбіраюць самі ў залежнасці ад матэрыялаў (фотаздымкі, аўдыё- і відэазапісы), набытых падчас палявой экспедыцыі, і ступені валодання камп'ютэрам. Публічнае прадстаўленне прэзентацый (афішыраванне) адбываецца на студэнцкай канферэнцыі, дзе прысутнічаюць не толькі студэнты – удзельнікі экспедыцыі, але і першакурснікі, якім яшчэ толькі давядзецца вывучаць такія дысцыпліны, як «Фалькларыстыка» і «Славянская міфалогія» ў другім семестры. Гэта вельмі важна як для першай групы навучэнцаў (набываюцца пэўныя навуковыя веды, арганізуецца матывацыйная дзейнасць студэнтаў па выкарыстанню камп'ютэрнай тэхнікі ў прафесійнай дзейнасці, ствараецца аснова для выхавання эмацыянальна-каштоўнасных адносінаў да культуры свайго народа і абмену гэтымі каштоўнасцямі), так і для другой (актывізуецца пазнавальная дзейнасць, адбываецца арыентацыя студэнтаў на творчы падыход да навучання).

Бясспрэчнымі станоўчымі якасцямі названага віду дзейнасці з'яўляюцца наступныя: захаванне прынцыпу свабоднага выбару (студэнты самі выбіраюць, у складзе якой групы працаваць, а таксама вызначаюць шляхі, крыніцы і форму прадстаўлення матэрыялу), арыентацыя на індывідуалізацыю вучэбнага працэсу, пошук інфармацыі, якой не хапае, і выкарыстанне яе для рашэння ўзнікаючых праблем, павелічэнне хуткасці і якасці засваення вучэбнага маэрыялу, практычная накіраванасць, пашырэнне спектра вучэбнай работы студэнтаў, павышэнне цікавасці (ад яе залежаць поспехі студэнтаў у вучэбнай дзейнасці) да вывучэння традыцыйнай духоўнай спадчыны беларусаў, павышэнне якасці адукацыі.

Фальклор – гэта жывая культура, якую неабходна падтрымліваць, надаваць новыя імпульсы яе існаванню. Важна захаваць пераемнасць паміж традыцыйнай культурай і сучасным культурным працэсам ва ўсіх яго праявах, разнавіднасцях і формах. У адваротным выпадку для традыцыйнай культуры рэальнай становіцца пагроза паступовага затухання, а для сучасных відаў мастацтва адрыў ад каранёў можа стаць прычынай страты глыбіні і мнагамернасці вынікаў розных форм творчасці. Таму сабраны студэнтамі падчас практыкі матэрыял можа быць выкарыстаны для трансляцыі ўзораў і каштоўнасцей фальклору ў мастацкай самадзейнасці і прафесійнай творчасці, іх папулярызацыі і прапаганды.